**УДК 930(476)"13/15"**

# JAGIELLONICA ЯК ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ ПРАБЛЕМА Ў ПРАЦАХ АЎТАРАЎ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

*Любы А. У.*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

*У артыкуле аўтар прасочвае зараджэнне і асноўныя змены падыходаў у гістарыяграфіі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы XIX – пачатку XX ст. навуковай праблематыкі, прысвечанай эпосе Ягелонаў у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага*

*Ключавыя словы: Ягелоніка; гістарыяграфія гісторыі Беларусі; гістарыяграфія Вялікага Княства Літоўскага XIX – пачатку XX ст.*

# JAGIELLONICA AS A HISTORIOGRAPHICAL PROBLEM IN THE WORKS OF AUTHORS OF THE 19th – EARLY 20th CENTURIES

*Liuby A.*
Belarusian State University, Minsk, Belarus

*In the article the author traces the origin and changes in the historiography of Central and Eastern Europe of the XIX – early XX centuries such scientific issues as the Jagiellonian era in the history of the Grand Duchy of Lithuania.*

*Keywords: Jagiellonica; historiography of the history of Belarus; historiography of the Grand Duchy of Lithuania of the XIX – early XX centuries.*

Што такое Ягелоніка? Прапануем спыніцца на такім абагульненым вызначэнні, як даследчыцкі накірунак у гістарыяграфіі гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, звязаны з панаваннем дынастыі Ягелонаў і фарміраваннем асаблівай геапалітыкі і культуры. Храналагічныя рамкі эпохі Ягелонаў адрозніваюцца ў залежнасці ад дзяржавы. Так, для Вялікага Княства Літоўскага прадстаўнікі дынастыі ўзыходзяць на прастол у 1440 г. і паступова перадаюць сваю ўладу выбарным каралям, звязаным з Ягелонамі матрыманіяльна, толькі пасля 1572 г.

Дынастычнае вымярэнне гістарычнага працэсу ў гістарыяграфіі закладаецца яшчэ ў эпохах Асветніцтва і Рамантызму ў нашай частцы Еўропы пад уплывам пераважна французскай і прускай школ гістарыяпісання. У 1780-я гг. да вырашэння праблемы дзяржаўнага і манархічнага ў гісторыі Рэчы Паспалітай спрабаваў звяртацца пры

стварэнні афіцыйнага гістарычнага наратыву ўраджэнец Піншчыны і выхаванец Ліонскага ўніверсітэта Адам Нарушэвіч [1, с. 404, etc.]. Праўда, наконт «дому Ягелонаў» у аснову яго рэчпаспалітаўскага наратыву былі б пакладзены высновы дзеяча Адукацыйнай камісіі і рэктара Кракаўскага ўніверсітэта Гуга Калантая [2, с. 12]. Аднак дынастычнае пераасэнсаванне гісторыі XV–XVI стст. у традыцыях індывідуалізаванага гістарызму адбываецца толькі ў працах па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага прафесара Віленскага імператарскага ўніверсітэта Іахіма Лелявеля. Лекцыі ім былі прачытаны ў Вільне ў 1820-я гг., але тэксты апублікаваны ўжо ў эміграцыі і пасля яго смерці [3; 4]. Традыцыя «дынастычнай» перыядызацыі (вылучэнне эпохі Ягелонаў, перыядызацыя, характарыстыка, праблематыка) у нацыянальным наратыве з'яўляецца ў межах Кракаўскай і Львоўскай школ гісторыі Польшчы ў сярэдзіне – канцы XIX ст. (напрыклад, наратыў Міхала Бабжыньскага) [5, с. 10–11]. Канчатковае вылучэнне самастойнай эпохі Ягелонаў і вывучэнне яе як прадмета даследавання афармляецца ў працах 1910–1930-х гг. пад уплывам персанальных даследаванняў Оскара Халецкага і Людвіга Каланскоўскага [6; 7].

Гістарыяграфія Ягелонікі прайшла своеасаблівы доўгі шлях асэнсавання сучаснікамі, уключэння ў гістарычны нацыянальны наратыў: ад «ліцвінскага» першай трэці XIX ст. і «польскага» другой паловы XIX ст. да складання нацыянальных гісторый міжваеннага часу дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. У дадзенай працы спынімся на гістарыяграфіі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства XIX – пачатку XX ст. Гэты перыяд важны з пазіцыі ацэнкі працэсаў інстытуалізацыі Ягелонікі ў гістарычнай навуцы рэгіёна, уплыву і інтэлектуальнага супрацоўлення, якое праяўлялася ў выбары праблематыкі і яе паступовым уключэнні ў гісторыю той ці іншай нацыі.

Аналіз «віленскага» перыяду даследавання праблемы практычна адсутнічае ў гістарыяграфіі. Гэта звязана з цікаўнасцю пераважна да біяграфій вучоных-гісторыкаў Віленскага імператарскага ўніверсітэта і іх па-за віленскімі кар'ерамі [8]. Выключэннем можа быць асоба І. Лелявеля і яго навуковая спадчына [9; 10]. Jagiellonica ў польскім гістарычным наратыве XIX – пачатку XX ст. была часткова прааналізавана ў спецыяльных працах па гісторыі дынастыі (У. Баркоўска, Я. Тэнгоўскі) [5; 11], унутранай і знешняй палітыцы (Х. Лаўмяньскі, Л. Каланкоўскі) [12–14]. Для беларускага нацыянальнага наратыва, як, зрэшты, і для

літоўскага і ўкраінскага, ацэначных прац гістарыяграфічнай з'явы ў ХХ і пачатку ХХІ ст. не склалася [15; 16].

### Фактар дынастыі Ягелонаў у перыядызацыі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства

Гістарыяграфія ХІХ ст. пачынае адкрываць комплексы наратыўных крыніц, што абумовіла развіццё як самой гістарычнай навукі, так і спецыяльных гістарычных дысцыплін. Першая палова ХІХ ст. прадстаўляе два матыватары для пошуку новых крыніц і ўвядзення іх у навуковы зварот. Па-першае, гэта фарміраванне калекцый старажытнасцяў: ад актавых і наратыўных крыніц (пераважна летапісаў і хронік, а таксама дзяржаўных і прыватных архіваў зніклых дзяржаўных фарміраванняў), кніжнай рукапіснай і друкаванай старыны да візуальных і археалагічных крыніц пра папярэднія эпохі. Па-другое, ва ўмовах ліквідацыі Рэчы Паспалітай як дзяржавы некалькіх палітычных народаў папярэдняя гісторыя рэгіёна раскладаецца таксама на некалькі гісторый. Ва ўмовах Віленскай вучэбнай акругі і ў структурах Віленскага імператарскага ўніверсітэта адбываецца адраджэнне (ці інстытуцыйнае нараджэнне) даследаванняў Вялікага Княства Літоўскага – дзяржавы, храналагічна ўпісанай у два працэсы – адыход ад агульнай «рускай» гісторыі (пасля 1240-х гг.) і ўключэнне ў гісторыю Рэчы Паспалітай у 1569 г.

Працэс асэнсавання ўласна «літвінскай» гісторыі абдываўся вельмі імкліва і не быў завершаны да 1826 г. стварэннем віленскай інстытуалізаванай гістарычнай школы, хаця ўсе перадумовы былі – кафедра гісторыі, навуковае кола, відавочны лідар у асобе І. Лелявеля. Аднак палітычная сітуацыя другой паловы 1820-х гг. не спрыяла развіццю ні акадэмічнай супольнасці Віленскага ўніверсітэта, ні далейшаму захаванню навуковых кадраў у межах Беларусі і Літвы. Прафесура, як і большасць актыўнай студэнцкай моладзі, пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. вымушана была пакінуць межы былога Вялікага Княства і прысвяціць сябе іншай праблематыцы, якая больш адпавядала новым месцам працы і крыніцавым зборам, не звязаным з Вялікім Княствам Літоўскім XV–XVI стст. [17, с. 32–35].

### Перыядызацыя ў гістарыяграфіі

Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства была падзелена І. Лелявелем на два макраперыяды, якія адпаведна

ўказвалі на панаванне ў дзяржаве дзвюх супрацьпастаўленых дынастый (Гедымінавічаў і Ягелонаў і Пястаў і Ягелонаў адпаведна) [9; 10; 18; 19]. Нягледзячы на агульнае паходжанне, дынастыя Ягелонаў, якая ўсталявалася ў Вялікім Княстве з увакняжання каралевіча Казіміра Ягелончыка, атаясамлялася з польскай дынастыяй і, адпаведна, страчваннем Вялікім Княствам Літоўскім сваёй самастойнасці ў выніку шэрагу заключаных уній. Эпоха Ягелонаў для Вялікага Княства раскрывалася як эпоха пераходнага тыпу ад самастойнай дзяржавы да яе ліквідацыі ў выніку далучэння да Рэчы Паспалітай у 1569 г. (ці смерці Стэфана Баторыя).

Да пытання ўвядзення абгрунтаваных гістарычнымі працэсамі храналагічных рамак эпохі Ягелонаў звярнуўся кракаўскі гісторык Юзаф Шуйскі, калі займаўся асобай Людовіка Анжуйскага і яго палітычнай спадчынай [12; 20]. Яго падыходы да эпохі Ягелонаў як пашырэнне польскасці ў рэгіёне знайшло ўвасабленне ў атаясамленні працэсаў уній Вялікага Княства з Польскім каралеўствам у канцы XIV–XVI ст. і трансфера польскай культуры на Усход [2, с. 60].

Датай пачатку кіравання дынастыі Ягелонаў у рэгіёне першапачаткова быў прапанаваны 1386 год. Як адзначае ў сваім аглядзе рэгіянальнай гісторыі прадстаўнік львоўска-кракаўскага гістарычнага асяродку Тадэвуш Вайцэхоўскі, пачатак эпохі аднолькава важны для двух дзяржаўных утварэнняў – Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага [21, с. 10]. Для Т. Вайцэхоўскага было прынцыпова паказаць, што польская дзяржава змагла канструктыўна пашырацца на Усход дзякуючы ўніі з ВКЛ («галоўная эпоха») [21, с. 8], займець новых супернікаў на наступныя войны: татараў і маскавітаў (прынамсі такой ацэнцы інагурацыйнага выступу новага рэктара Wszechnicy Lwowskiej 1884 г. прытрымліваўся Х. Лаўмянскі) [21, с. 6, 8, etc.; 12, с. 1–2]. Што тычыцца гісторыі ўласна Вялікага Княства Літоўскага, то Т. Вайцэхоўскі адзначае, што магчыма вылучыць дзве эпохі – да уніі з Польшчай і пасля (тут аўтар разумеў два фарматы трансляцыі культуры на ўсход – палітычнай і рэлігійнай) [21, с. 8, 10].

Асэнсаванне завяршэння эпохі прыйшлося чакаць яшчэ два дзесяцігоддзі – у пачатку XX ст. працамі Ф. Канечнага і О. Халецкага быў сфармуляваны канец эпохі, звязаны з пераменамі ў форме абрання манарха, знешняй палітыцы і прававых адносінах у складовых частках Рэчы Паспалітай [22; 23].

## Персанальны і калектыўны вобраз Ягелонікі ў гістарыяграфіі

Створаны І. Лелявелем падчас працы прафесарам Віленскага імператарскага ўніверсітэта гістарычны наратыў Вялікага Княства Літоўскага на некаторы час заставаўся адзіным завершаным наратывам гэтай дзяржавы. Менавіта І. Лелявель змог абгрунтаваць перыядызацыю эпохі Ягелонаў (ад Ягайлы да Жыгімонта Аўгуста), абумоўленую праблемай знешняй пагрозы і заключэннем уній Вялікага Княства Літоўскага з Польскім каралеўствам [24, с. 25, etc.]. У гісторыі Вялікага Княства прафесар вызначыўся з падыходамі да розных этапаў развіцця, якія дазволілі даследчыку-рамантысту параўноўваць развіццё дзяржавы і ацэньваць тыя ці іншыя этапы па якаснаму прынцыпу. У сваіх даследаваннях гісторыі Вялікага Княства І. Лелявель абапіраецца на супрацьпастаўленне дасягненняў эпохі Ягелонаў у ВКЛ і папярэдняга перыяду. Эпоха Ягелонаў уяўляе для І. Лелявеля перыяд развіцця інстытутаў шляхецкай дэмакратыі, залаты час прававой культуры. Схільнасць да параўнанняў пастунова выпрацоўвалася ў школе даследчыка і дала свае парасткі ў яго паслядоўніках пры развіцці польскай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XX ст. [25, с. 118–119].

Гістарычны наратыў Вялікага Княства Літоўскага ў І. Лелявеля падзяляўся на дзве буйныя эпохі і вызначаўся дзейнасцю прадстаўнікоў манаршых дынастый – Ягелонаў і «да-Ягелонаў» (назавем іх Гедымінавічамі). У ацэначныя катэгорыі павінна была быць пастаўлена знешняя палітыка, развіццё права і кадыфікацыя законаў, стварэнне і трансфармацыя органаў і інстытутаў улады. У вобразе своеасаблівага нацыянальнага героя маглі выступаць асобныя прадстаўнікі дынастыі. І, адпаведна, дынастычнае вымярэнне гісторыі заставалася асноўным пры ацэнцы дасягненняў дзяржавы. Галоўнае, што дала эпоха Ягелонаў, – гэта аб'яднанне асобных частак у адзіную дзяржаву пры Жыгімонце Аўгусце [10, с. 135–136].

Трэба ўлічыць, што і персона І. Лелявеля, і само становішча і развіццё Віленскага імператарскага ўніверсітэта заўсёды выклікалі разначытанні ў спецыяльнай літаратуры. Дзейнасць выпускніка ўніверсітэта (1808 г.), прафесара і загадчыка кафедры (1815–1824 гг.) неаднаразова станавілася прадметам даследавання гістарыяграфіі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы [10; 26; 27].

Адным з першых да персоны І. Лелявеля як даследчыка Вялікага Княства Літоўскага Ягелонскай эпохі звярнуўся выпускнік Віленскага

ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя і стваральнік персанальнай навуковай школы ў Познаньскім універсітэце імя А. Міцкевіча Хенрык Лаўмяньскі [26]. У 1950–1960-я гг. пры Польскай акадэміі навук была створана група даследчыкаў і перапрацавана спадчына Лелявеля ў шматтомным выданні «Joachim Lelewel. Dzieła». Пазней біяграфія Іахіма Лелявеля неаднаразова станавілася ілюстрацыяй да вобраза героя эпохі 1830-х гг. Так, яго прэзентавалі ў калектыўнай манаграфіі «Польскія гісторыкі», а Стэфан Кеневіч прысвяціў яму асобную працу «Іахім Лелявель», якая была выдадзена па-руску ў папулярнай серыі «ЖЗЛ» [28; 29]. У канцы XX – першым дзесяцігоддзі XXI ст. І. Лелявель разглядаецца інтэрнацыянальнай персонай у гістарыяграфіях Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Яго творчасць трапляе ў абагульняючыя працы па гістарыяграфіі XIX ст.

Пэўнай стратай для гістарычнага наратыву стала эвалюцыя да творчай кар'еры Юзэфа Ігнацыя Крашэўскага, адыход ад даследаванняў Вялікага Княства і сярод іншых выпускнікоў Віленскага імператарскага ўніверсітэта. Фактычна да другой паловы XIX ст. гісторыя беларускіх і літоўскіх зямель былога Вялікага Княства разглядалася толькі сыходзячы са спадчыны І. Лелявеля, якая актыўна друкавалася з 1840-х гг. у Заходняй Еўропе – Парыжы ці Брусэлі. Яго архіў фактычна атрымае сваё другое нараджэнне дзякуючы даследаванням антрапалогіі польскай гістарыяграфіі ў другой палове XX ст.

Наколькі наратыў І. Лелявеля мог уплываць на даследчыкаў Вялікага Княства эпохі Ягелонаў у сярэдзіне – другой палове XIX ст.? У Расійскай імперыі Вялікае Княства становіцца спачатку «незапатрабаванай» дзяржавай. Толькі ў апошняй трэці XIX ст. адбываюцца спробы яе інтэграцыі ў гісторыю Расіі ў якасці рэгіянальнай гісторыі.

Цікавасць да Ягелонаў і Вялікага Княства Літоўскага становіцца своеасаблівым кантрастам пры асэнсаванні працэсаў ва Усходняй Еўропе ў XV і XVI стст. Параўнанні праводзіліся найперш з папярэдняй эпохай «Гедымінавічаў», калі адбывалася збіранне рускіх зямель пад уладай Вільні, што разглядалася як магчымасць стварэння Вялікага Княства як спадчынніка Кіеўскай Русі (напрыклад, працы М. К. Любаўскага, Д. Іլавайскага) [30; 31]. Водавочнай мяжой паміж самастойнай эпохай і эпохай падпарадкавання становіцца палітыка дынастыі вялікіх князёў, накіраваная на дзяржаўны і ваенны саюз з Польскім каралеўствам, якую запачаткаваў вялікі князь Уладзіслаў-Ягайла і якая актыўна працягвалася ў другой палове XV і праз

XVI ст. прадстаўнікамі яго роду. Такім чынам, заняпад самастойнасці і антырускі ва ўсіх разуменнях – ад міжнароднай актыўнасці да этнічнай і рэлігійнай палітыкі ўнутры дзяржавы – характар палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ўказвае на працэсы, якія прывялі да страты дзяржаўнасці падчас Люблінскай уніі. Да такіх высноў прыходзяць аўтары маскоўскай школы, якія бачылі ў дынастыі Ягелонаў дэградуючы элемент для самастойнага Вялікага Княства Літоўскага.

У 1880-я гг. Кіеўскі ўніверсітэт імя Св. Уладзіміра становіцца своеасаблівым альтэрнатыўным агрэгатарам для стварэння лакальных (нацыянальных) наратываў унутры агульнай гісторыі Расійскай імперыі. Тут варта вылучыць ураджэнца Рэчыцы Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага, які ў канцы XIX ст. стварае эканамічны наратыў Вялікага Княства Літоўскага эпохі Ягелонаў [32]. У яго дысертацыі закранаюцца пытанні арганізацыі дзяржаўнай гаспадаркі і даецца аналіз падатковай сістэмы Вялікага Княства. Свае абагульненні па перыяду М. Доўнар-Запольскі выклаў у пачатку 1920-х гг. на старонках абагульняючай працы «Гісторыя Беларусі», якая стала даступна шырокаму колу чытачоў толькі ў 1994 г. [33]. Нават ацэнка перыяду панавання Ягелонаў у Вялікім Княстве давалася адрозная. Так, асоба Казіміра Ягелончыка і яго праўленне ацэньваецца як элемент стабілізацыі дзяржавы пасля смерці Вітаўта [33, с. 62, etc.]. Як прадстаўнік напрамку эканамічнай гісторыі М. Доўнар-Запольскі звязваў працэсы развіцця грамадскай сістэмы і дзяржаўнай актыўнасці ў XVI ст. менавіта з пераўтварэннямі гаспадаркі і сацыяльна-эканамічнага ўкладу Вялікага Князтства, адрознага ад Расійскай дзяржавы таго ж перыяду [34].

У польскай гістарычнай думцы другой паловы XIX ст. над пытаннямі перыядызацыі гісторыі дзяржавы, у тым ліку і па вылучэнні эпохі Ягелонаў, напрыклад, у развіцці ваеннай гісторыі, працаваў ураджэнец Мінска Тадэвуш Корзан. Перыяд Ягелонаў акрэслены дзвюма датамі – 1386 і 1572 гг. і характарызуе не толькі пералік ваенных кампаній, але і прынцыпы агульнай ваеннай палітыкі, пераход да наёмнага войска і іншыя змены, якія характэрны для фарміравання вайсковай справы ў дзяржаве Ягелонаў [35, с. 107, etc.]. У «Гісторыі войнаў і вайсковай справы» аўтар прытрымліваецца супрацьпастаўлення дзвюх дынастычных эпох – Пястаў і Ягелонаў.

Над праблематыкай эпохі і ўпісаннем у польскі нацыянальны гістарычны наратыў прадстаўнікоў дынастыі Ягелонаў пачынаюць

задумвацца ў апошняй чвэрці XIX ст. у навуковых асяродках Львова і Кракава, у межах Аўстра-Венгерскай імперыі. Стварэнне навучальных устаноў і планаванне навучальнага працэсу падштурхоўвае да стварэння спецыяльных гістарычных наратываў, сістэматызацыі ведаў пра нацыянальную польскую гісторыю. У гэтых планах эпосе Ягелонаў, як, зрэшты, і самім прадстаўнікам дынастыі, адводзілася асаблівая роля. Калі папярэднікі Ягелонаў Пясты былі дынастыяй польскай, то Ягелоны разглядаліся як прышлыя на польскім прастоле. Адпаведна паразы і страты, якія адбыліся ў іх час, запісваліся ў адмоўныя вынікі кіравання.

## Замест заключэння

Напярэдадні Першай сусветнай вайны і на працягу 1918–1921 гг. адбывалася станаўленне нацыянальных наратываў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, у тым ліку беларускага, літоўскага, украінскага – спадчыннікаў Рэчы Паспалітай, створанай Ягелонамі [36]. Чаму ж Ягелоніка не патрапіла ў нацыянальны гістарычны наратыў? Стагоддзі XV і XVI устойліва сталі асацыіравацца з двума маркёрамі эпохі: палітычнымі уніямі з Польшчай і войнамі з Расійскай дзяржавай, – што прывяло ў сукупнасці да страты самастойнай дзяржавы. Развіццё наратываў у 1920–1930-я гг. прыўнесла яшчэ адзін маркёр з адмоўнай канатацыяй – класавы антаганізм, пры якім дынастычнае вымярэнне гістарычнага працэсу стала непрэзентабельным.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Grabski, A. F.* Dzieje historiografii / A. F. Grabski; wprow. Rafał Stobiecki. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2011. – Wyd. 3. – XIX, 866 s.

2. *Smoleński, W.* Szkoły historyczne w Polsce: główne kierunki poglądów na przeszłość / W. Smoleński. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1887. – 86 s.

3. *Lelewel, J.* Histoir do la Lithuanie et de la Ruthénie, jusqu'à leur union définitive avec la Pologne: conclue à Lublin en 1569 / J. Lelewel; traduit par E. Rykaczewski, avec les notes du traducteur. – Paris et Leipzig, 1861.

4. *Lelewel, J.* Wykłady kursowe z historii powszechnej w Uniwersytecie Wileńskim, 1822–1824 / J. Lelewel; oprac. M. H. Serejski // Dzieła / Joachim Lelewel. – Warszawa: PWN, 1959. – T. 3. – 797, [3] s.

5. *Borkowska, U.* Dynastia Jagiellonów w Polsce / U. Borkowska. – Warszawa: PWN, 2011. – 630, [2] s.

6. *Любы, А. Ул.* Jagiellonica паміж Оскарам Халецкім, Аляксандрам Гейштарам і Ежы Гедройцам: паняційныя асновы трансфармацыі сучаснай

гістарыяграфіі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы / А. Ул. Любы // Исследование истории Восточной Европы: сб. науч. ст. – Минск: РИВШ, 2018. – Вып. 18. – С. 206–220.

7. *Любы, А. Ул.* «Jagellonum Universum» Оскара Халецкага і яго ўплыў на гістарыяграфію канца XX – пачатку XXI стагоддзя / А. Ул. Любы // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого- педагогические науки: сб. науч. ст. – Минск: РИВШ, 2017. – Вып. 17. – С. 256–264.

8. *Litwinowicz-Droździel, M.* O starożytnościach litewskich. Mitologizacja historii w XIX-wiecznym piśmiennictwie byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego / M. Litwinowicz-Droździel // Biblioteka Literatury Pogranicza. – Kraków: Universitas, 2008. – T.17. – 227 s.

9. *Lelewel, J.* Historia polska do końca panowania Stefana Batorego / J. Lelewel; oprac. Z. Kolankowski // Dzieła / Joachim Lelewel. – Warszawa: PWN, 1962. – T. 6. – 540 s.

10. *Lelewel, J.* Dzieje Litwy i Rusi aż do unii z Polską w Lublinie 1569 zawartej / J. Lelewel; oprac. J. Ochmański; wstępem poprzedził H. Łowmiański // Dzieła / J. Lelewel. – Warszawa: PWN, 1969. – T. 4. – 254 s.

11. *Tęgowski, J.* Genealogia Jagiellonów w historiografii / J. Tęgowski // Genealogia Jagiellonów i Domu Wazów w Polsce / Z. Wdowiszewski. – Kraków: Avalon, cop. 2005. – S. 5–18.

12. *Łowmiański, H.* Polityka Jagiellonów. Wydanie drugie / H. Łowmiański. – Poznań: Wyd. Poznańskie, 2006. – 673 s.

13. *Kolankowski, L.* Polska Jagiellonów: dzieje polityczne / L. Kolankowski. – Lwów: Skł. gł. w Księgarni Gubrynowicz i Syn, 1936. – 374 s.

14. *Kolankowski, L.* Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego za Jagiellonów / L. Kolankowski. – Warszawa: Skład Główny Kasa im. Mianowskiego, 1930. – T. 1: 1377–1499. – IX, [1], 474 s.

15. *Карев, Д. В.* Белорусская и украинская историография конца XVIII в. – начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д. В. Карев. – Вильнюс: ЕГУ, 2007. – 310 с.

16. *Василенко, В.* Політична історія Великого князівства Литовського (до 1569 р.) в східнослов'янських історіографіях XÏX – першої третини XX ст.: монографія / В. Василенко. – Дніпропетровськ: Нац. гірн. ун-т, 2006. – 659 с.

17. *Błachowska, K.* Wiele historii jednego państwa. Obraz dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego do 1569 r. w ujęciu historyków polskich, rosyjskich, ukraińskich, litewskich i białoruskich w XIX wieków / K. Błachowska. – Warszawa: Neriton, 2009. – 410 s.

18. *Lelewel, J.* Początkowe prawodawstwa polskie cywilne i kryminalne do czasów jagiellońskich [Электронны рэсурс] / J. Lelewel // Polona: Biblioteka Narodowa. – Рэжым доступу: https://polona.pl/item/poczatkowe-prawodawstwa-p-

olskie-cywilne-i-kryminalne-do-czasow-jagiellonskich,MTQ2NzU3/3/#info:metadata. – Дата доступу: 10.052021.

19. *Lelewel, J.* Dzieje Polski Joachim Lelewel potocznym sposobem opowiedział, do nich dwanaście krajobrazów skreślił / J. Lelewel. – Warszawa: W drukarni J. Weskiego. 1829. – 332 s. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.wbc.poznan.pl/dlibra/show-content/publication/edition/82446?id=82446. – Дата доступу: 10.05.2021.

20. *Szujski, J.* Dzieje Polski podług ostatnich badań / J. Szujski. – Lwów: nakładem K. Wilda, 1862. – T. 2: Jagiellonowie / spisane przez J. Szujskiego. – VI, 340 s.

21. *Wojcechowski, T.* Podział i zakres dziejów polskich: odczyt Tadeusza Wojciechowskiego w sali inauguracyjnej Wszechnicy Lwowskiej przy otwarciu roku szkolnego 1884/85 / T. Wojcechowski. – Lwów: [s.n.], 1884 (Lwów: W. Łoziński). – 17 s.

22. *Koneczny, F.* Dzieje Polski za Jagiellonów / F. Koneczny. – Kraków: Krakowski Towarzystwo Oświaty Ludowej, 1903.

23. *Halecki, O.* Dzieje Unii Jagiellońskiej / O. Halecki. – Kraków: Akademia Umiejętności; nakł. Funduszu Nestora Bucewicza, 1919–1920. – T. 1–2. – 482; 385 s.

24. *Czerniecka-Haberko, A.* Unie polsko-litewskie w historiografii polskiej / A. Czerniecka-Haberko. – Toruń: Wydawnictwo Adam Marszałek, 2013. – 341 s.

25. *Grabski, A. F.* Zarys historii historiografii polskiej / A. F. Grabski. – Wyd. 2. – Poznań: Wyd. Poznańskie, 2003. – 277 s.

26. *Łowmiański, H.* Lelewel jako historyk Litwy i Rusi / H. Łowmiański // Z badań nad pracami historycznymi Joachima Lelewela: referaty i głosy dyskusyjne z sesji naukowej UAM zorganizowanej ku uczczeniu setnej rocznicy śmierci. – Poznań: Un-t im. Adama Mickiewicza, 1962.

27. *Grabski, A. F.* Badania nad Joachimem Lelewelem w Polsce współczesnej (1945–1960) / A. F. Grabski // Kwartalnik Historyczne [Электронны рэсурс]. – RCIN: Repozytorium Cyfrowe Instytutów Naukowych. – Рэжым доступу: http://rcin.org.pl/Content/28392/WA303_41882_A52-KH-R-68-1_przeglady.pdf. – Дата доступу: 10.05.2021.

28. *Kieniewicz, S.* Joachim Lelewel / S. Kieniewicz. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1990. – 248 s.

29. *Кеневич, Я.* Лелевель / Я. Кеневич. – М.: Молодая гвардия, 1970. – (Серия: «Жизнь замечательных людей»).

30. *Любавский, М. К.* Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. С приложением текста хартий, выданных княжеству Литовскому и его областям / М. К. Любавский. – М.: Моск. худ. печатня, 1915. – 312 с.

31. *Иловайский, Д. И.* Московско-Литовский период, или Собиратели Руси / Д. И. Иловайский. – 2-е изд. – М.: Типо-лит. Высоч. утв. Товарищества И. Н. Кушнерев и К., 1896. – Т. 2: Века XIV и XV. – 528, 75 с.

32. *Довнар-Запольский, М. В.* Государственное хозяйство Великого Княжества Литовского при Ягеллонах / М. В. Довнар-Запольский. – Киев, 1901. – 807 с. (Мінск: Беларус. навука, 2013. – 759 с.)

33. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск: БелЭн, 1994. – 510 с.

34. *Довнар-Запольский, М.* Западнорусская семейная община в XV веке / М. В. Довнар-Запольский. – СПб., 1897.

35. *Korzon, T.* Dzieje wojen i wojskowości w Polsce / T. Korzon. – Kraków: Akademia Umiejętności, 1912. – T. 1: Epoka przedrozbiorowa; z il. Wykonanemi podług pomników przez Bronisława Gembarzewskiego i mapą narysowaną przez Jadwigę z Prószyńskich Rogową. – VII, [1], 387 s.

36. *Любы, А. Ул.* Дынастыя Ягелонаў у гістарыяграфіі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы: станаўленне нацыянальных наратываў міжваеннага час / А. Ул. Любы // Сацыяльныя інстытуты ў Вялікім Княстве Літоўскім у ранні Новы час: матэрыялы міжнар. навук. кругл. стала, Мінск, 2 снеж. 2020 г. / БДУ, Гіст. фак., Каф. гісторыі Беларусі старажыт. часу і сярэд. вякоў; [пад рэд. А. У. Любага]. – Мінск: БДУ, 2020. – С. 7–11.

**(Дата паступлення: 14.05.2021).**